У абласной бібліятэцы імені В. І. Леніна

1-га студзеня 1949 года спаўняецца 30 год з дня ўтварэння Беларускай ССР. У чэсць вялікага свята беларускага народа калектыў Віцебскай абласной бібліятэкі імені В. І. Леніна ўзяў на сябе сацыялістычнае абавязацельства—разгарнуць шырокую прапаганду дасягненняў нашай рэспублікі і вобласці за 30 год, выкарыстаць усе формы культурна-асветнай работы для мабілізацыі працоўных на выкананне пяцігодкі ў чатыры гады.

У сваіх абавязацельствах калектыў бібліятэкі ўдзяляе асаблівую ўвагу паляпшанню зместа работы, лепшаму абслугоўванню чытачоў. У рэзалюцыі Усерасійскай нарады бібліятэчных работнікаў, якая нядаўна адбылася ў Маскве, гаворыцца, што «асаблівая ўвага бібліятэк павінна быць накіравана на прапаганду грамадска-палітычнай, прыродазнаўча-навуковай, тэхнічнай, сельскагаспадарчай літаратуры і літаратуры па пытаннях пяцігадовага плана і рашэння лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б)».

Паклаўшы ў аснову сваёй работы рашэнне нарады, калектыў бібліятэкі правёў рад мерапрыемстваў па прапагандзе вышэйуказанай літаратуры.

У сучасны момант кніжны фонд бібліятэкі складае больш 100 тысяч экземпляраў. За 11 месяцаў бягучага года зроблена каля 250 тысяч кнігавыдач. 50 працэнтаў выдачы складае грамадска - палітычная, прыродазнаўча-навуковая, тэхнічная, сельскагаспадарчая літаратура і літаратура па пытаннях пяцігадовага плана. У мэтах шырокай прапаганды тэхнічнай літаратуры ў бібліятэцы арганізавана кніжная выстаўка на тэму: «Павышай сваю вытворчую кваліфікацыю», складаюцца рэкамендацыйныя спісы.

Шляхам арганізацыі бібліятэк-перасовак і рэкамендацыі літаратуры праз абанемент і зал для чытачоў шырока прапагандуецца і сельскагаспадарчая літаратура. Адбыўшаяся сесія Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імені Леніна высунула задачу шырокай прапаганды вучэння І. В. Мічурына і яго паслядоўнікаў. У мэтах прапаганды і прымянення на практыцы гэтага вучэння бібліятэкай праведзена лекцыя на тэму: «Акадэмік Лысенка і яго роля ў развіцці мічурынскага вучэння», арганізаваны выстаўкі прац прадстаўнікоў перадавой біялагічнай навукі, а таксама кніг аб перадавіках сельскай гаспадаркі.

За апошні час значна павялічыўся попыт на палітычную і прыродазнаўча-навуковую літаратуру. Вялікая работа праводзіцца бібліятэкай на прапагандзе твораў Маркса — Энгельса — Леніна—Сталіна.

Для больш глыбокага азнаямлення чытачоў з лепшымі творамі савецкіх пісьменнікаў за апошні перыяд праведзены канферэнцыі чытачоў па кнігах лаўрэатаў Сталінскай прэміі: Б. Палявога «Аповесць аб сапраўдным чалавеку», П. Паўленка «Шчасце» і Вершыгара «Людзі з чыстым сумленнем».

Для задавальнення попыту чытачоў на адсутнічаючыя кнігі ў фондзе бібліятэкі скарыстоўваецца міжбібліятэчны абанемент. Гэта дазваляе абслугоўваць неабходнай літаратурай з кніжных фондаў Усесаюзнай бібліятэкі імені В. І. Леніна, Ленінградскай бібліятэкі імені Салтыкова-Шчадрына і рэспубліканскай імені В. І. Леніна.

Выключная ўвага ўдзяляецца бібліятэкай дзецям. Для іх абсталяван спецыяльны зал. Дзіцячы аддзел бібліятэкі добра ўкамплектаван мастацкай, палітычнай і навукова-папулярнай дзіцячай літаратурай. Яго кніжны фонд складае каля 12 тысяч экземпляраў. У гэтым годзе дзіцячы аддзел наведала больш 40 тысяч чытачоў.

У сувязі з падрыхтоўкай да святкавання 30-годдзя БССР бібліятэка разам з абласным аддзелам па справах культурна-асветных устаноў арганізавала выезды работнікаў ва ўсе раёны вобласці. Для інструктажу і абагульнення вопыту праведзен семінар работнікаў раённых, сельскіх, школьных бібліятэк і бібліятэк партыйных кабінетаў.

Бібліятэка ўзяла на сябе абавязацельства давіцца да канца года 300 тысяч кнігавыдач, мець 200 тысяч наведванняў, узмацніць масавую работу і палепшыць абслугоўванне чытачоў, давіцца шырокай прапаганды пяцігадовага плана і дасягненняў Беларускай ССР ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі і культуры.

Г. ЗАЙЦАЎ,
дырэктар Віцебскай абласной бібліятэкі імені В. І. Леніна,
Г. ШЭЙНІНА,
загадчык метадычнага кабінета.